БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоўская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Міньску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 13. Менск. Панядзелак 8 красавіка 1918 г. Год 1

Менск 8/IV.

Гасударство-дыліжанс.

Ангельскі вучоны Лоуэль прэдстаўляе сабе гасударство так: па дарозе едзе вялізны дыліжанс, побач фурмана, трымаючаго лейны, сядзяць некалькі людзей (партыі), яны спрэчаюцца і сваруцца паміж сабой і крычаць фурману: «куды едзеш! бярыся лявей! а цяпер—у права! гані скарэй! памалу!» Фурман (правіцельство) адным вухам слухае, але усе сілы зьбірае, каб ні выпусьціць лейнаў с сваіх рук. На запятках дыліжансу сядзіць пара старых джэльтмэнаў і у падзорную трубку агледаюць праехапую дарогу. У сярэдзіне наглуха зачыненаго дыліжансу, сядзяць пасажыры (народ), яны чуюць толькі ляяг гаяк, калёсаў і слаба разумеюць, куды іх вязуць, і аб чым там спрэчаюцца фурманы.

* * *

У часі рэвалюцый бываюць усялякія палажэнні. Дыліжанс перарабляецца: робіцца з вокнамі, сьветлы, старых кансэрватароў саўсім высажываюць. пасажыры слухаюць спрэчкі фурманоў, скідаюць іх аднаго за другім. Бывае, што кіруюць адразу тры—чатыры возюры; дыліжанс та ляціць, як вецяр, та з маху загразае на ўсе чатыры колы, кожны фурман працуе па сваей праграме, каб давясьці людзей да райскай страны, дзе без калючак ружы красуюць і людзі шчасьліва жывуць.

Можа быць, што коцінца часамі дыліжанс без пасажыроў, вывярнуўшы іх на бок, у канаву. Пасажыры ідуць самапасам, ніведаючы куды, а фурманы ляскаюць з біча, аж рэхо грыміць па лясах і балотах, імчаць пусты воз, толькі пыл курыць!

Альбо німа ў фурманоў дыліжансу, а «пракапіць» публіку трэба, дык робяць дыліжанс с паперы ён на усё прыдатны,—толькі ні да язды.

* * *

Але усё і у нас прыдзе патрохі да парадку. Грамадзянскае развіцце мае свае законы, іх ніякім канём ні абьедзіш. Само нацыянальнае жыцце фармуючыся с хаоса разрухі ваеннай, эканамічнай, палітычнай, выкрышталіцца у ясную форму. Формы гэтай іньча ні чый розум ні згадае.

Дакуль-жа?

Мінае другі месяц с таго часу, як і апошнія з магіканаў расійскаго Урадоваго цэнтралізму бальшэвіцкія сатрапы уцяклі з Міиску. Чорнай на заўсёды астанецца мамяць аб іх у нашым народзе, каторы быў здавалося ужо так блізка ад бажанай сабе мэты—нізалежнасьці. З іх уцекам канчаўся круг тых цяжкіх разчараванняў, якія прышлося вынесьці народу за часоў царскаго а потым рэвалюцыйнаго папавання вялікарусаў у нашым краі. Шмат цяжкіх нацыянальных уразаў, праньму нішчырасьці і вераломства нават з боку так званных дэмакратаў і соцыялістаў расійскіх уключаў у сябе гэты скончэны круг. Але здавалося што гэта ужо скончано і на заўсёды. Началося жыцце пры новых варунках. Калі і зноў з'явіліся расчараванне, гэта меней баліць нам, бо шмат якія з іх можна сабе лёгка растлумачыць.

Але ёсьць такія справы у нашым новым жыцці якіх ніяк нельга растлумачыць. Хто мог бы заверыць, што пры такіх варунках, як цяпер у нас, магчыма пляновая і афіцыяльная руссіфікацыя беларусоў? І што гэтым займаюцца наеждзые расейцы, якіе стараюцца сумысьле затрымацца самі на Беларусі і іншых сабе падобных затрымліваюць у нас, каб змагацца з пашым культурным адраджжэннем? Хто можа паверыць, што усімі справамі прасьветнымі у сэрцы Беларусі—Міншчыне заведуюць адны толькі расейцы, што нават нісьвядомых беларусоў—беларусоў с прозьвішча сярод іх німа ніводнаго? Хто возьмецца гэтае з'явішча растлумачыць?

Есьць іншэ і дробные непаразумення. Аказуецца, што гэтые «прасьветнікі» беларускаго народу належаць да партыі с.-р., якая гэтак хваліцца сваею «фэдэрацыей». Добрая б то было фэдэрацыя, ніхай яе на сухія лясы. І яшчэ цікава, што нікаторые с «прасьветнікаў» гагэтуль яшчэ лічуцца сябрамі Рады Рэспублікі, нават былі і народнымі сэкрэтарамі. Праўда яны прэдстаўлялі вялікарусоў толькі, а ні каго іншаго, але хібаж прызнавалі ну-ну хоць права на самаадзначэнне тое, ці што, якое гэтак запагаміла расейская дэмократыя. І няўжож пры гэтым яны справу прасьветы, якая па іхнай жэ праграмі належыць аўтономным нацыянальным органам, асьмеліліся узяць у свае рукі, а самых беларусаў усіх атхіліць ат гэтай важнейшай із нацыянальнай справы?

Гэта так Беларусы як былі так і астаюцца грунтам на якім узрастае вялікаруская культура. Сьвядомые беларусы атсунуты ад справы прасьветы. Ніхай жыве Вялікарусія! Але хай памятаюць нашые прасьветнікі, што есьць справы, калі па словам старых кнігаў—камні возопіют і грунт трасецца і разьдзеляецца зямля на часткі.

Будзе тое і тут. Над народам бяз концу зьдекавацца нельга. Ён зразумея дабрату сваіх апекуноў і заплаціць ім шчыраю падзякою.

А. Б.

Агульныя весткі.

— Паводлуг швэйцарскіх газэтаў у Альзасе узмацніліся баі. Французскія салдаты, быўшыя у одпуску, у граічных с Швэйцарыяй дэпартаментах: у Жэнэве заклікапы да нібаўнаго звароту у свае часьці.

У канале Ля-Манш аткрыты вялікія мінаваныя палі. Французскія порты Гавр і Шэрбург прырыхтаваны для прыняцця ангельскіх транспортаў.

Парыжская прэфэктура, хочучы высьніць меру нямецкіх гранатаў якія нападаюць ў Парыж, выдала прыказ каб жыхары зносілі у прэфэктуру усе знойдзеныя кавалкі гранатаў.

Пачынаючы с палавіны прошлаго тыдня пад Калэ штодзенне летаюць нямецкія самалаты. На горад і яго ваколіцы скінута шмат бомбаў. Дзякуючы зробленым сховам ахвяр людзьмі ні было. Нямецкія самалеты далетаюць да гораду ні ўважаючы на энэргічную абарону процiў іх.

— Па весткам ад 3 г. м. зносіны паміж Англіяй і Францыяй па электрычнаму кабэлю тымчасова перэрваны. Тэлеграмы перавозяцца пачтовымі параходамі.

— Французская палата аднаголасна прыняла бюджэт. Міністр фінансаў Клётц павіншаваў палату с першым бэздэфіцытным ваенным бюджэтам.

— Амэрыканское войско выслано на фронт Монжідіэр. Вашынгтонскі урад апавешчае што у бітвы будуць пасунуты да 100.000 амэр. салдатаў.

— «Journal des Debats» кажа, што нямецкія арміі стаяць цяпер шмат бліжэй да Амьену, чым у 1914 годзе. Гэта вялікі выйграш нямецкаго глаўнаго камандавання, каторае можа прыгражаць цяпер вялікай артэрыі злучаючай Парыж—Амьен.

— Аўстрыйская камісія у Кіеві зрабіла умову аб звароце палонных з Украінай. Такая-ж умова будзя зраблена і з Вялікарасіяй.

— 28 сакавіка турэцкая палата депутатаў аднаголасна прыняла мірныя трактаты з Росіей і Украінай.

— У звязку с паведамленнем Бальфура у ангельскім парламэнці, што ангельскі урад ні якім чынам ні можа забезпечыць Ірляндзіі нізалегласьці, з Ірляндскаго конвэнту выступіла значная часьць депутатаў.

— Лыойд-Джордж нібыто сказаў делегацыі конвэнту, каторая намагалася схіліць яго да прызнання за Ірляндзіяй права на самаозначэнне, што Ірляндзія павінна шукаць свайго шчасьцця у связку з Англіяй. Ніякі ангельскі урад ні дапусьціць найменшай зьмены моцы Англіі праз якога нібудзь гатунку Ірляндскую самаістнасьць.

— Выканаўчы камітэт ангельскай соцыялістычнай работнічай партыі, маючы на у вазе сытуацыю на усходным фронце, пастанавіў ні вясьці часова сваей прапаганды у справе мэтаў вайны.

Одгук вайны.

Чаго плачаш маладзіца,
Чаму дробны слезы льеш.
Чаго нудзіш? Аткажы мне.
Чаму песьняў ні пяеш?
Помню я, бывало, з рана
У поле выйдзяш жыта жаць,
Запяеш, як птушка ў гаі,
Проста любо пастаяць
Альбо раніцай да ўсходу
Па ваду к крыніцы йдзеш,—
Вецяр с косамі гуляе,
А ты зноў сабе пяеш
Так ад ўсходу да заходу
Чуў я голас мілы твой.
А ціпер,—чаму ты змоўкла?
Хто змуціў душы спакой?
Дзе падзеўся голас звонкі?
Дзе схавалася каса?
Скуль ўзялася на павеках
Крышталёвая сьляза?

Нівядомы.

Весткі з Расіі.

— Рада народных камісараў пастанавіла вярнуць г. Петраграду яго даўнейшую назву —Пецербург.

— Панцырны крэйсэр «Адмірал Макароў» пабудаваны у 1906 годзе затапіўся пры уходзе у Рэвель, наткнуўшыся на міну.

— На конфэрэнцыі у Маскве, кадэты і усе соцыялістычныя партыі, апрача бальшэвікоў, прынялі рэзалюцыю з дамаганнем ад хаўрусьнікаў помачы у справах арганізацыі і абароны Расіі, без парушэння яе сувэрэнасьці.

— Паслы дзержаваў коаліцыі разам з трыма пасламі скандзінаўскіх дзержаваў на спэцыяльнай нарадзе у Пецербургу ухвалілі суместнае выступленне з патрэбаваннем ад савецкаго ураду станоўных гарантыяў нібэзпечнасьці жыцця і мення жывучых у Расіі асобаў чужога паддаства.

— Каля Нікольска—Уссурыйскаго шмат ахвіцэраў за апошні час пераходзіць у казакі. У ваколіцы села Боленкі і ст. Уссурі Уссур. ж. д. бывшыя ахвіцэры закладаюць новыя пасялення на каммунальных варунках. Жыхары—толькі людзі інтыллігентныя. Апрача ахвіцэраў селяцца інжэнеры, дактары, тэхнікі, аграномы і г. інш.

Весткі с краю.

Бабруйск.

У Бабруйску начальнік цывільнаго ураду польскаго корпусу выдау у польскай, беларускй і рускай мовах прыказ, касуючы усе «дэкрэты» аб скасаванні прыватнай уласнасьці. У працягу 10 дзен мусіць быць зьвернуто уласьнікам усе ніпрауна забранае дабро. Усе сельскія работнікі павінны зараз-жа вярнуцца да працы і прыступіць да сеубы. Уся аммуніцыя рассійскаго войска, гранаты, набоі, стрэльбы, вазы,коні, павінны быць зданымі валастным і месцовым установам ні пазней 1 красавіка.

„Памятаючы старопопьскі дэвіз: роунасьць усіх перад правам, без рожніцы веры і народнасьці, станоуна прыказую утрымацца перад усякай помстай над абыватэльствам. Усе што дагэтуль рабілася і выклікала разстройства дзержаунаго ладу і анархію у краю апіралася на нізкім развіцці селянства. Інтылігентнейшыя станы у весках мусяць лічыць павінасьцю зараз-жа начаць арганізацыю зьвязкау сельскіх работнікау, пробных палеу, ахронак і школау. Заклікаю усіх да спауненя грамадзянскаго абавязку і перасьцерагаю, што усякія пробы збройнаго атпору, і наагул нідбаласьць да прыказау цывільнаго ураду будуць сурова курацца, аж да вырому сьмерці".

Вільня.

У Вільні у скутку вайны, развіліся так званая „рэпэрацыйная" прамысловасьць. Аб гэтым сьведчаць такія абвесткі у газэтах:

«Падраныя панчохі шкарпэткі перарабляю на нова»..

Найгорш абношэныя начныя і дзенныя кашулі, перарабляю на элеганцкія дзянныя"...

Перарабляю рукавічкі з мужскіх на дамскія, з вялікіх на меньшыя, з доугіх раблю дзьве пары»...

З сурдутау, жакетау, фракау і рускіх мундзерау раблю гамаркі, комбіную усякія перарабкі, спэцыальна ліцую"...

(Dz. Wil.)

З гэтаго відаць як абнасіліся Вілянцы.

Беларускі тэатр.

У пятніцу 5 красавіка у «Беларускай Хаці» (Конскі пляц) «Першым Беларускім Таварыствам Драмы і Камэдыі» была пастаулена камэдыя Крапіуніцкаго «Пашыліся у дурні».

Збор быу нівялічкі; мусі вакалічная публіка ужо занадта змучылася спэктаклямі у «Беларуск. Хаце», што ідуць на працягу цэлаго тыдня кожны дзень. Хаця нельга сказаць каб ні было ужо пільнай патрэбы асьвежыць рэпэртуар „Драмы і Камэдыі". Аб гэтым вельмі рупіцца рэжысэр Ф. Ждановіч, але ж грашавыя прычыны і нідастатак, праз гэта, дэкорацыяу, а так сама і свабоднаго часу, ні дае покуль што нарыхтаваць справу нашаго тэатру як найлепей. Камэдыя „Пашыліся у дурні" зрабіла на публіку вельмі пекнае уражэнне Асабліва здатна скарыстау сваю ролю сам рэжыссэр Ф. Ждановіч (Нічыпар). Перад публікаю прайшоу жывы абраз заблудзіушаго пьянюшкі, што дзяубе адно і тое самае аб «дьзвех чарках», якія выпіты с кумам Пятром. С самаго пачатку свае зьявы на сцэні аж да канца «Нічыпар»» трымау самую напружанную увагу публікі, якая доуга выклікала Ждановіча ка у апошні раз зачынілася заслона.

Добра веу сваю ролю Крыніца (Дрэуко), які падае вельнкую надзею, умацоуваючы с кажным разам сваю здольнасьць у адпаведальных і сурьезных ролях.

Так сама расьце спрытнасьць Андрэева, маладого зусім хлапца—артысты. Сваю ролю (Антон—парабак) ен выканау як мае быць.

Янку Беларуса заменьвау Жакоускі у ролі Куксы, а самого Жакоускаго у яго звычайнай ролі «Пісара» заменьвау Міцкевіч. Абодва справіліся дось гладка.

Нізгорш так сама правеу У. Фальскі свайго «Васіля».

Жаночыя ролі ні маюць у сабе даволі вагі, каб у іх можна было выказаць артысткам тую ці іншую сваю здатнасьць.

Ролі іх больш маучлівыя і паказаць, у такім разе, сваю ігру німа магчымасьці. Ганулю іграла В. Тарасік, Грыпіну—Пралеска.

У суботу 6 красавіка «Першае Таварыство Драмы і Камэдыі паставіло у „Беларускай Хаце» «Сягоняшнія й даунейшыя» драму К. Буйло у 3 актах і камэдыю «Модны Шляхцюк» замес абвешчанай у афішках камэдыі Галубка „Хвароба у добрым здароуі".

Драму «Сягонняшнія й даунейшыя» артысты йгралі с вялікім пад'емам і яна зрабіла на публіку моцнае уражэнне ні гледзючы на тое, што у залі было два зусім пьяных нямецк. фэльдфэбэлі, псаваушых гэтае уражэнне сваімі танцамі каля аркестру у часе антрактау і нават ні стыдаушыхся падаваць з мейсца рэплікі на сцэну у часе самае ігры. Такі цікаві выпадак гэтаго вечару адцягвау шмат увагі публікі. Хацелася б пажадаць каб гэта прыкраса нашаго маладого тэатру была першым і апошнім здарэннем.

Ф. Ждановіч (Раман) быу звычайне пекным.

Пралеска (Гануля) была добраю дзеля яго парай; яна вела сваю ролю, як ніколі адважна і спрытна, асабліва у другім акце на рантце з Раманом у адзежы простай селянскай дзяучыны. Дось гладка йграла і у апошнім акце у адзежы сястры міласэрдзя.

Крыніца, Янка Беларус і Пятровіч выразна паказалі тыпы старасьвецкай шляхты: Гаспадара (бацька Рамана), Сауковіча і Панкратоускаго.

«Моднаго Шляхцюка» (Пранцішак) іграу Янка Беларус, як і трэ было чэкаць пекна.

Жакоускі нізгорш іграу свата Пранцішка —Якубэ.

Ф. Ждановіч у ролі Яна—жывы абраз старога, аудавелаго гаспадара бацькі Ганны. В. Тарасік удалася роля Ганны як мае быць.

Нітрудную ролю Ігнася легка выканау Фальскі.

Нізгоршым Андрэям (сват Ігнася) выйшоу Пятровіч.

Будзям спадзявацца што маладыя сілы нашых артыстау пайдуць у гару, а сьвежыя творы нашых пісьменнікау і лепшыя варункі нашаго нацыянальнаго жыцця дадуць больш сілы і пэунасьці мастакам нашаго тэатральнаго штукарства.

Знаемы.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

«Юбілейны дом», на Захараускай вул. які цяпер заняты пад народны унівэрсытэт, бадай скора асвабодзіцца і, як выясняецца с перагаворау паміж беларусау і прэдстауніком праваслаунаго духавенства—інспэктарам сэмінарыі Пановым, можэ перайсьці да беларусау, дзе будуць адбывацца лекцыі народные канцэрты, тэатр і т. п.

Рамесленныя школы на стольні, відаць патрэбны на весцы, што самі селяне пачалі ужо аб гэтым старання перад Губернскім Земствам. Справа гэта будзе разглядацца 17 красавіка—на сабранні Губ. Земства.

Выехаушаму на харчы з дазволу нямецкаго начальства начальніку харчовай часьці пры упрауленні Л.-Р. ж. д. Прэабражэнскому — разам з асобнай камісіі—выдано 100000 рубл.

Пры афіцэрскім бюро ужо наладжаны аддзелы:

1) кравецкая майстэрня,
2) Харчовы аддзел,
3) шавецкая майстэрня,
4) шапачная майстэрня,
5) Парыкмахерская і
6) общэжыціе на 400 чалавек.

Скарбонячны збор для беззработкых, які хацеу зрабіць камітэт грамадзкой обязпекі,—забаронены.

Немцы ні прызнаюць беззработных: на тое, кажуць яны, есьць рабочыя дружыны, дзе за працу і харчуюць. і плацяць грошы.

Запіс на работы у Нямэччыну ідзе шпа ка. Запісаушыхся ужо каля 10000 душ, найбольш с Польшчы. Хутка усе яны будуць атпрауляны, як кажуць, у Саксонію.

Рух на лініі Л.-Р. ж. д. за апошніе часы слабы: на вучастку Менск—Гомель ходзяць два пасажырскіе цягнікі—туды і назад. Таварнаго руху—німа ніякаго. Праезд толькі с пропускамі, інакш высаджываюць на першай стацыі.

Менск пусьцее: ня толькі бедната, запісаушаяся на работы, але выежджаюць людзі і з багацейшаго стану: дамауласьнікі, дзеячы крэдытных кантор, банкіры, дактары і інш. Напудзіло іх найбольш, як кажуць, рэгістрацыя харчоу, якая мае пачацца с 15-го красавіка.

Цэны за апошніе дні на рынку трымаюцца гэткія: хлеб—1 р. 70 к., сланіна—8 р., каубаса—4 р. за фунт Возік дроу—ахапкі два—40 р.

Аржаную муку у слуцкім павеці можна дастаць па 17 р. за пуд.

Афіцэрам будзе свабодны выезд у Расію, ба тые чуткі, што афіцэры, выехаушые адгэтуль, запісываюцца на амэрыканскую службу,—ніпраудзівыя.

Ішчэ адна дэлегацыя ад служачых Л-Р. ж. д с трох чалавек з інжэнерам Рошчыным на чале выехала у Маскву да народных камісарау выясніць, якая доля чакае само упрауленне і яго служачых.

У рускім клюбі у пятніцу 5-го красавіка адбыуся агульны сход членау. Найцікаунейшай справай была крадзежа у быушаго распарадзіцеля-старшыні Гагарына 8000 р. клюбных грошей.

Прызнаючы сябе віноуным у неакуратнасьці. п. Гагарын абяцауся у скорым часе выплаціць 3000 рубл., а на 5000—прасіу зрабіць раскладку на 5 гаду.

Члены клюбу, прызнаючы заслугі п. Гагарына, згадзіліся дараваць яму 1000 р., калі толькі ен заплаціць усе 7000 у гэтым року.

Дэлегацыя ад служачых Л.-Р. ж. д., якая выехала адгэтуль па ліквідацыйныя грошы да народных камісарау, набралася німала клапотау.

Сперша дэлегацыя папала у Пецербург; адтуль, дастаушы грошы, трапіла у Рамны; з Рамноу загнало іх безпатрэбы у Маскву, азе і цяперь седзяць у вагонэ і пільнуюць—нібыто звычайнай паперы—свайго скарбу. З Менска выехалі арцельшчыкі на падмогу і выручку. Замест належных 60, атрымала дэлегацыя 20 міліонау рубл.

І гэта, як знайшлі; відаць «воук дарогу перабег».

У міліцыю нямецкае начальство маніцца паназначаць асабліва на важнейшыя мейсцы як у Менску, так і у паветах—даунейшых „заслужаных" служакау, пазашываушыхся дагэтуль у нашым месце. Нат слово «міліція» мае быць заменена на „паліцыю".

На Украйну хутка выезжае 5-ы эшалон вайсковых украінцау (1000 ч.) ужо зарэгістрованых.

Цяпер началася запіс і для цывільных (Юр'еуская, 16).

8-го красавіка аткрываецца амбулаторыя для хворых украінцау.

Курсы беларусазнауства.

Панядзелак 8-го красавіка.

А. Уласоу. Бюджэты гаспадарак і валасьцей у Беларусі.

Аутарак 9 красавіка,

А. Смоліч. Гэографія Беларусі.

Серада 9 красавіка.

Я. Ліосік. Гісторыя Вялікаго Князьства Літоускаго.

Лекцыі чытаюцца ад 6—8 гадз. у залі Беларускай Рады) (Захароуская, 43).

Праверачны збор для афіцэрау, вайсковых чыноунікау, дактароу і салдатау, служыушых у рускай арміі с 1-го акцября 1913 г. назначаны нямецкай камэндантурай на 8-го красавіка а 7-ой гадз. раніцы на зборнім пункце пры упрауленні вайсковаго начальніка. Для украінцау—у клюбі (на рогу Падгорнай і Скобелеускай), для палякоу—у б. шляхоцкім доме.

На гарадзкую почту нямецкае начальство адпусціло 5000 мар.

Лекцыя А. Уласова.

5 красавіка.

Лік слухачоў на курсах беларусазнаўства с кажным днём павялічываецца. Шкода толькі, што мала відаць моладзі з сярэдніх школаў. Ім, гэтым будучым дзеячом нашаго краю, трэба болі цікавіцца яго асобнасьцямі.

Лекцыя п. А. Уласова мела вялікую цікавасьць. Лектар зрабіў поўны нарыс нашаго эканамічнаго становішча і паказаў кірунак, ў якім павінна весьціся праца, для павялічэння добрабыту ў краю.

Лекцыя п. А. Уласова была аснована на, так сказаць, «жывым» матер'яле і ўключала массу лічбаў, трафна асьветляных лектарам. Нам здаецца толькі, што дадаўшы да сваёй лекцыі асобна зробленыя табліцы і дыаграммы, якія-б можна было вывесіць, ці выпісаць на табліцы, лектар зрабіў бы сваю лекцыю больш карысной для слухачоў.

Маем надзею, што шаноўны лектар прачытае цэлую сэрыю сваіх лекцыяў, якія-б пасля можна было і надрукаваць.

Рэдактар А. Прушынскі.

Выдавецтво Т-во «Зарання».

Друкарня Я. А. Гришблата.